**Кур'яновіч Ю.У.**

# ГІСТОРЫЯ МІЛІЦЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1920–1930-х гг.: ПРАБЛЕМАТЫКА ВЫВУЧЭННЯ І АГЛЯД КРЫНІЦ

Даволі маладаследаванымі ў айчыннай гісторыі застаюцца пытанні станаўлення, развіцця і дзейнасці праваахоўных органаў у 1920–1930-х гг. і, у прыватнасці, аднаго з цэнтральных звёнаў сіл правапарадку – міліцыі [1]. Часткова гэта тлумачыцца спецыфічнасцю самой праваахоўнай структуры і абмежаваным доступам даследчыкаў да неабходных крыніц, у першую чаргу дакументаў архіваў КДБ і МУС. Як адзначае І. Саракавік, «установы ўнутраных справаў (міліцыя) у сілу сваёй спецыфікі больш за ўсё падвергнутыя тэндэнцыям самастойнасці і адчужанасці. А спецыфіка вызначаецца ваенізаванасцю сістэмы, закрытасцю ці паўзакрытасцю шэрагу накірункаў яе дзейнасці, пераважна прымусовым характарам дзейнасці, якая закранае інтарэсы многіх грамадзян» [2]. З іншага боку, варта зазначыць, што дадзеная тэма можа ўяўляецца даследчыкам непрывабнай і вузкай у грамадска-палітычным кантэксце і з пункту гледжання гісторыі.

Трэба адзначыць, што ўвогуле па гісторыі Беларусі ў 1920 – 1930-х гг. не бракуе літаратуры, а ў навуковых працах і шматлікіх публікацыях, у якіх краіна разглядаецца ва ўмовах таталітарнай сістэмы, па-за ўвагай даследчыкаў не застаецца дзейнасць органаў, якія выконвалі праваахоўныя функцыі: суда, пракуратуры, органаў дзяржаўнай бяспекі, да якіх зазвычай адносяць Надзвычайную камісію, Аб'яднанае дзяржаўнае палітычнае ўпраўленне і Народны камісарыят унутраных спраў (НКУС) [3], складовай часткай якога з'яўлялася міліцыя [4]. Але функцыянаванне апошняй у асноўным падаецца фрагментарна. Прыкладам могуць служыць грунтоўныя работы Т. Процькі і М. Касцюка [5], прысвечаныя зацвярджэнню савецкай таталітарнай сістэмы ў Беларусі.

Заўважым, што ў поўным аб'ёме станаўленне, развіццё і фукцыянаванне праваахоўнай сістэмы савецкай Беларусі ў айчыннай гістарыяграфіі не асвятлялася.

Дзейнасць жа міліцыі ў даваенны перыяд савецкага часу найбольш вывучана прафесарам А. Ф. Вішнеўскім, які, дарэчы, першы ўзняў тэму ўдзелу міліцыі Беларусі ў ажыццяўленні карнай палітыкі савецкай дзяржавы. Але да ягоных прац мы звернемся ніжэй.

Наконт вартасці даследаванняў гісторыі міліцыі ў зададзеных храналагічных рамках адзначым наступнае.

Па-першае, міліцыя як адміністрацыйна-ваенізаваны орган савецкай улады [6] з самага пачатку сваёй дзейнасці з'яўлялася адным з найважнейшых механізмаў станаўлення і ўмацавання гэтай улады ў Беларусі. А пасля рэарганізацыі структуры і кіравання ёю, якія адбыліся на мяжы 1920 – 1930-х гг. яна ператварылася, як падкрэсліў А. Ф. Вішнеўскі, «у яшчэ адну дадатковую сілу, накіраваную на знішчэнне палітычных праціўнікаў і апанентаў Сталіна і тым самым – на ўзмацненне рэжыму яго асабістай улады, на разгром сялянства, якое супраціўлялася калектывізацыі, на тое, каб прывесці краіну ў цэлым і кожнага чалавека ў асобнасці ў анямене перад страхам быць у любы час пакараным не толькі за непажаданае дзеянне або бяздзеянне, але і за іншадумства» [7, с. 86].

Па-другое, менавіта ў гэты час адбылося станаўленне прафесіянальнай савецкай міліцыі і былі закладзены асновы арганізацыйнай пабудовы міліцыі, якія ажно па сённяшні дзень развіваюцца і ўдасканальваюцца, а таксама прынцып падвойнага падначалення міліцыі, калі, з аднаго боку, начальнікі мясцовых органаў міліцыі па рабоце з'яўляюцца непасрэдна падначаленымі і падсправаздачнымі начальнікам вышэйстаячых міліцэйскіх органаў, а з другога – кіруюцца ўказаннямі мясцовай выканаўчай улады і таксама падсправаздачныя ёй.

Трэба падкрэсліць, што ў разгляданы перыяд побач з рэпрэсіўнай дзейнасцю міліцыя (у адрозненне ад органаў дзяржаўнай бяспекі) праводзіла вялікую работу па прадухіленні і раскрыцці забойстваў, рабункаў, крадзяжоў, канакрадстваў, займалася вышукам крымінальнікаў, забяспечвала ахову грамадскага парадку. У той час адбылося станаўленне падраздзяленняў міліцыі, якія і зараз не толькі функцыянуюць, але і не

Рэпазіторый ВГУ

змянілі свае асноўныя кірункі дзейнасці і нават абрэвіятуры, як, напрыклад, крымінальны вышук (сёння ў структуры цэнтральнага апарату МУС гэта Галоўнае ўпраўленне крымінальнага вышуку крымінальнай міліцыі) і Дзяржаўная аўтамабільная інспекцыя (Упраўленне дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі міліцыі грамадскай бяспекі).

Паўнавартаснае навуковае адлюстраванне мінулага мажлівае толькі на аснове спалучэння гістарычных крыніц ва ўсёй іх разнастайнасці. Нягледзячы на існуючыя аб'ектыўныя цяжкасці ў вывучэнні гісторыі міліцыі ў зададзеных храналагічных рамках (абмежаваны доступ да дакументаў архіваў МУС і КДБ, заідэалагізаванасць публікацый і кніг савецкага часу), даследчыкам гуманітарных дысцыплін застаецца яшчэ багата матэрыялу, які патрабуе больш пільнай увагі і навуковага аналізу.

Крыніцы па вывучэнні гісторыі міліцыі ў 1920–1930 гг. умоўна можна падзяліць на тры асноўныя групы: дакументальныя (дакументы архіваў і музеяў), дакументы заканадаўства, статыстычныя матэрыялы.

Што тычыцца архіваў Беларусі, то матэрыялы аб міліцыі даваеннага часу захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ), абласных гістарычных архіваў, архіваў МУС і КДБ. Сярод фондаў, дзе дадзеныя дакументы найбольш сканцэнтраваны і сістэматызаваны па храналагічна-структурнаму прынцыпу, у першую чаргу трэба назваць наступныя фонды НАРБ: НКУС БССР (ф. 34), Галоўнага ўпраўлення міліцыі і крымінальнага вышуку (ф. 35), Школы міліцыі ім. Фрунзэ пры Галоўным упраўленні міліцыі і крымінальнага вышуку НКУС БССР (ф. 37). У справах гэтых фондаў захоўваюцца пастановы, цыркуляры, інструкцыі НКУС РСФСР і БССР, пратаколы паседжанняў калегій і нарад НКУС БССР, пратаколы агульных сходаў супрацоўнікаў міліцыі, справаздачы аб рабоце асноўных служб цэнтральнага апарата НКУС БССР і аддзелаў Галоўміліцыі БССР, справаздачы павятовых міліцый, дадзеныя аб асабовым складзе Галоўміліцыі БССР і павятовых міліцый, дакументы аб беларусізацыі міліцыі, статыстычныя дадзеныя аб дзейнасці міліцыі і крымінальнага вышуку, зводкі аб здарэннях, матэрыялы аб культурна-асветніцкай дзейнасці в органах міліцыі, праграма школы міліцыі ім. Фрунзэ і аўтабіяграфіі яе курсантаў.

У архіве МУС назапашаны дакументы, першыя па часе з якіх датуюцца 1932 г. У фондах яны сістэматызаваны па храналагічнаму прынцыпу. Пастановы, цыркуляры і загады сканцэнтраваны ў 50-м фондзе.

Пэўная колькасць цікавых матэрыялаў захоўваецца ў цэнтральным музеі МУС Рэспублікі Беларусь. Гэта ў асноўным фотадакументы, а таксама некаторыя каштоўныя рэчавыя экспанаты, сярод якіх, напрыклад, унікальнасцю вызначаецца першы і адзіны рэспубліканскі знак «Пачэснаму міліцыянэру», якім узнагароджваліся ў 1920-я гады лепшыя супрацоўнікі беларускай міліцыі.

У вывучэнні нарматыўна-прававой базы дзейнасці міліцыі добрым дапаможнікам з'яўляецца «Храналагічны даведнік» І. Саракавіка [8], дзе зроблены кароткі гістарычны агляд асноўных дакументаў пра органы ўнутраных спраў Беларусі, а таксама пра ўдзел грамадскіх арганізацый у ахове грамадскага парадку і барацьбе са злачыннасцю за перыяд з 1917 па 2002 гг.

Пры аглядзе крыніц па вывучэнні гісторыі міліцыі ў 1920 – 1930 гг. варта асобна спыніцца на некаторых выданнях. У 1927 г. пабачыў свет «Кароткі нарыс гісторыі міліцыі Беларусі (1917–1927)» – кніга, якая выйшла накладам 1000 асобнікаў пад агульнай рэдакцыяй і з прадмовай народнага камісара ўнутраных спраў Алеся Сташэўскага, і складальнікамі якой з'яўляліся супрацоўнікі НКУС БССР. Гэта была першая кніга па гісторыі беларускай міліцыі і, заўважым, напісаная па-беларуску. Яе аўтары змаглі сістэматызаваць і ў храналагічным парадку выкласці матэрыял аб арганізацыйнай пабудове міліцыі, яе штатах, матэрыяльным забяспячэнні, раскрытых злачынствах. Але ў кнізе адсутнічаюць тэарытычныя высновы, навуковы аналіз



Рэпазіторый ВДУ

гістарычнага матэрыяла. Нягледзячы на гэтыя недахопы, выданне мае дастатковы эмпірычны матэрыял для навуковага абагульнення.

У 1987 г. пад грыфам «для службовага карыстання» з друку выйшла найбольш грунтоўнае даследаванне савецкага перыяду – кніга калектыва аўтараў «Очерки истории милиции Белорусской ССР. 1917 – 1987» [9]. Незважаючы на ідэалагізаваную скіраванасць, выданне каштоўна багатым і разнастайным фактычным матэрыялам.

Робячы агляд навуковых выданняў па гісторыі міліцыі ў 1920 – 1930 гг., нельга абыйсці увагай працы ўжо вышэй узгаданага прафесара А. Ф. Вішнеўскага, сярод якіх прыкметна выдзяляецца манаграфія «Организация и деятельность милиции Беларуси. 1917 – 1940 гг.: историко-правовые аспекты» [10]. Дарэчы, ён таксама прымаў непасрэдны ўдзел і ў напісанні «Очерков истории милиции…» 1987 г.

І нарэшце, варта ўзгадаць дужа карысны і адзіны бібліяграфічны паказальнік «На страже правопорядка: (к 90-летию белорусской милиции)» [11], у якім сабрана найбольш значная літаратура аб беларускай міліцыі, у тым ліку і літаратурныя творы, змешчаны бібліяграфічныя апісанні манаграфій, матэрыялаў канферэнцый, артыкулаў з часопісаў і зборнікаў.

1. У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2003 г. № 263-З «Аб органах унутраных спраў» (зарэгістраваны ў Нацыянальным рэестры прававых актаў Рэспублікі Беларусь 18 ліпеня 2007 г. № 2/1360) міліцыя – *«сістэма падраздзяленняў органаў унутраных спраў, якая прызначана абараняць жыццё, здароўе, гонар, годнасць, правы, свабоды і законныя інтарэсы грамадзян, правы і законныя інтарэсы арганізацый, інтарэсы грамадства і дзяржавы ад злачынных і іншых процiпраўных замахаў»*. Яна з'яўляецца складовай часткай сістэмы органаў унутраных спраў – «дзяржаўных праваахоўных органаў, якія ажыццяўляюць барацьбу са злачыннасцю, ахову грамадскага парадку і забяспечваюць грамадскую бяспеку».
2. У нядзеючым ужо Законе Рэспублікі Беларусь ад 26 лютага 1991 г. № 637-XII «Аб міліцыі» (зарэгістраваны ў Нацыянальным рэестры прававых актаў Рэспублікі Беларусь 15 сакавіка 2001 г. № 2/284) міліцыя вызначалася як *«дзяржаўны ўзброены праваахоўны орган, прызначаны абараняць жыццё, здароўе, правы, свабоды і законныя інтарэсы грамадзян, грамадства і дзяржавы ад злачынных і іншых процiпраўных замахаў»*.
3. Саракавік, І. Да пытання пра перыядызацыю гісторыі міліцыі Беларусі 20 ст. / І. Саракавік // Гістарычны альманах на старонках камунікату [Электронны рэсурс]. – 2002. – Рэжым доступу : http://kamunikat.fontel.net/www/czasopisy/almanach/07/07sarakavik.htm. – Дата доступа : 08.08.2011.
4. Першапачаткова рэспубліканскі НКУС быў створаны ў студзені 1919 г., але ў сакавіку гэтага года ў сувязі з утварэннем Літоўска-Беларускай савецкай рэспублікі (Літбел) спыніў дзейнасць, а свае функцыі перадаў аддзелу Упраўлення міліцыі Мінскага губваенрэўкома і Народнаму камісарыяту ўнутраных спраў Літбел. 17 снежня 1920 г. па рашэнні ІІ Усебеларускага з'езда Саветаў Камісарыят унутраных спраў Ваенрэўкома быў пераўтвораны ў Народны камісарыят унутраных спраў (НКУС) ССРБ.
5. НКУС ССРБ у 1920-х гг. займаўся пытаннямі савецкага будаўніцтва, адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання, камунальнай гаспадаркі, у яго структуру ўваходзіла міліцыя і органы ЗАГС. У снежні 1930 г. НКУС БССР быў ліквідаваны, а яго функцыі перададзены іншым органам улады (ЦВК, Наркамюсту БССР і інш.). У 1934 г. быў утвораны НКУС БССР з новай структурай, вядучымі падраздзяленнямі якой з'яўляліся Упраўленне дзяржаўнай бяспекі (УДБ) і Упраўленне рабоча-сялянскай міліцыі (УРСМ). На раённым узроўні адзіным апаратам, які выконваў задачы органаў НКУС, было райаддзяленне (РА) НКУС. Начальнік аддзялення міліцыі РА НКУС БССР адначасова з'яўляўся памочнікам начальніка РА па міліцыі.
6. Першапачаткова міліцыя ў Беларусі была створана ў сакавіку 1917 г. пасля Лютаўскай рэвалюцыі, калі Часовы ўрад абвясціў «замену полиции народной милицией с выборным начальством, подчиненным органам местного самоуправления». Днём заснавання беларускай міліцыі лічыцца 4 сакавіка. У гэты дзень у 1917 г. згодна загаду грамадзянскага каменданта г. Мінска Б. Самойленкі на пасаду часовага начальніка міліцыі Усерасійскага Земскага Саюза па ахове парадку ў горадзе быў прызначаны служачы Усерасійскага Земскага Саюза Міхаіл Міхайлаў (пад гэтым прозвішчам хаваўся бальшавік Міхаіл Фрунзэ).
7. Улічваючы сацыяльна-палітычныя абставіны, нявызначанасць дакладнага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу, а таксама часовую акупацыю нямецкімі і польскімі войскамі, гаварыць аб фарміраванні на тэрыторыі Беларусі штатнай структуры савецкай міліцыі да лістапада 1920 г. не варта.
8. Першае палажэнне аб Галоўным упраўленні рабоча-сялянскай міліцыі (Галоўміліцыі) Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ) было зацверджана 30 лістапада 1920 г. Камісарыятам унутраных спраў Ваенрэўкома Беларусі, у распараджэнні якога знаходзілася Галоўміліцыя.
9. У 1920 г. у склад Галоўміліцыі як аддзел следча-вышуковай міліцыі ўваходзіў крымінальны вышук (Галоўвышук). 26 красавіка 1922 г. згодна з загадам НКУС БССР яго вывелі з падпарадкавання міліцыі. У цэнтры было створана Упраўленне крымінальнага вышуку, непасрэдна падначаленае наркаму ўнутраных спраў. 22 сакавіка 1924 г. Упраўленне крымінальнага вышуку ліквідуюць, а яго функцыі перадаюць Галоўміліцыі БССР, якую пераймяноўваюць ва Упраўленне міліцыі і крымінальнага вышуку НКУС БССР. У 1927 – 1930 гг. – Адміністратыўнае ўпраўленне НКУС БССР, у 1930 – 1934 гг. – Галоўнае ўпраўленне міліцыі і крымінальнага вышуку пры СНК БССР.
10. Гл.: Протько, Т. С. Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917 – 1941 гг.) / Т. С. Протько. –

Репозиторий ВГУ

Минск.: Тесей, 2002. – 688 с.; Касцюк, М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М. Касцюк. – Мінск : Экаперспектыва, 2000. – 308 с.
11. Так вызначалася міліцыя паводле Палажэння аб рабоча-сялянскай міліцыі і крымінальным вышуку БССР, зацверджанага 27 лютага 1930 г. У адпаведнасці з Палажэннем аб рабоча-сялянскай міліцыі, якое было зацверджана СНК СССР 25 мая 1931 г. і дзейнічала да 1962 г., міліцыя вызначалася як адміністрацыйна-выканаўчы орган савецкай улады, галоўнай задачай якога з'яўлялася ахова рэвалюцыйнага парадку і грамадскай бяспекі, неабходных для сацыялістычнага будаўніцтва.
12. Вишневский, А. Ф. Организация и деятельность милиции Беларуси. 1917 – 1940 гг.: Историко-правовые аспекты / А. Ф. Вишневский. – Минск : Тесей, 2000. – 224 с.
13. Гл.: Саракавік, І. Гісторыя органаў унутраных спраў Беларусі: храналаг. давед. / І. Саракавік. – Мінск : Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 2002. – 200 с.
14. Очерки истории милиции Белорусской ССР, 1917 – 1987 / М-во внутрен. Дел. БССР, Мин. высш. шк. милиции ; В. Н. Савичев [и др.] ; под общ. ред. В. А. Пискарева. – Минск : Беларусь, 1987. – 535 с.
15. Вишневский, А.Ф. Организация и деятельность милиции Беларуси. 1917 – 1940 гг. : историко-правовые аспекты / А. Ф. Вишневский. – Минск : Тесей, 2000. – 224 с.
16. На страже правопорядка: (к 90-летию белорусской милиции) : библиограф. указатель / М-во внутрен. дел, Акад. МВД ; сост. Ж. Б. Швед (рук.) [и др.]. – Минск : Акад. МВД Респ. Беларусь, 2007. – 68 с.

**Шевелев П.В.**

## ОСОБЕННОСТИ ИНТЕРПРЕТАЦИИ ЗАКОНОДАТЕЛЬНЫХ ИСТОЧНИКОВ ПРИ ИЗУЧЕНИИ СЕМЕЙНО-БРАЧНЫХ ОТНОШЕНИЙ НА ТЕРРИТОРИИ СОВЕТСКОЙ БЕЛОРУССИИ ПЕРИОДА 1920–1930-х гг.

С развитием антропологического поворота в исторической науке, внимание ученых-историков все больше стали привлекать темы связанные с жизненным опытом и миром простого человека, с его реагированием на политику государства и ее влиянием на жизнь простого обывателя. Однако, вместе с новыми перспективами исследований, появились и новые трудности. Пожалуй, самая главная из них связана поиском информации и попыткой реконструировать поведение человека ушедшей эпохи на ее основании. С возникновением такого рода вопросов, появилась необходимость и новых методов получения информации, а также ее интерпретации. В связи с этим, целью данной работы является попытка показать особенности интерпретации содержащейся в законодательных материалах информации. В качестве объекта исследования в историко-антропологическом русле, мы выбрали семейно-брачные отношения на территории советской Белоруссии в 1920-е – 1930-е гг.

В целом, особенность законодательных источников по любому периоду состоит в том, что они декларируют то, как должно было быть. На вопрос было ли так на самом деле, они не отвечают и для получения ответов нужно привлекать другие виды источников. В изучении темы семейно-брачных отношений 1920-х – 1930-х годов, к источникам такого характера можно отнести Кодекс о браке семье и опеке РСФСР 1918 года, новые Кодексы о браке 1926 РСФСР и 1927 БССР [2]. Так, до принятия в БССР Кодекса 1927 года, на ее территории действовали законы принятые в 1918 году в РСФСР и декларировавшие признание брака зарегистрированного только в органах ЗАГС. Никаких иных форм брака, судя по данному Кодексу, не допускалось [3]. Вместе с тем, мы знаем, что в период 1920-х годов, существовало минимум четыре способа создания семьи, и все они могли порождать юридические последствия, несмотря на отсутствие регистрации данного события [7, с.216 - 218]. Последующие кодексы были более адаптированы к реалиям времени. Например, они уже допускали фактический брак, однако, в вопросах регулирования семейных отношений после регистрации или в случае развода, часто снова оставались декларативными [5]. Такая особенность законов, конечно же, не говорит о неактуальности их изучения. Работая с ними, можно получить информацию о том, какую цель ставило перед собой руководство страны, создавая данный закон, какого поведения со стороны населения хотело добиться и для чего это было нужно. Например, непризнание религиозного брака и поощрение зарегистрированного, могло быть продиктовано двумя причинами. С одной стороны, это была часть политики отде-



Репозиторий ВГУ